ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
ЧАЦВЕР
21
КРАСАВІКА
№ 13 (1571)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

У наступным нумары чытайце

— А вы спрабавалі запытацца ў каго-небудзь, што гэта такое? На нашым факультэце колькі ўжо гавораць. Толькі нічога не змянілася пасля яго ўвядзення...

— Няма ў нас самакіравання. Хіба дзе-небудзь на паперы, у пастановах...

— Я прапанаваў бы студэнтам самім вырашаць пытанні з вольным наведваннем і размеркаваннем стыпендый, са стварэннем вучэбных праграм і атэстацыяй выкладчыкаў. Гэта сапраўдная дэмакратыя.

— Ведаеце, мне самакіраванне спаць спакойна начамі не дае. І так паварочваю гэтую думку і гэтак. Усё адно атрымліваецца: не падрыхтаваны да яго студэнты. Не так, як трэба, успрымаюць. Самастойнасці не хапае ці чаго яшчэ?

На адных факультэтах яно дзейнічае і нават пабочнае вока заўважае яго рэальную карысць. На другіх перамен не адбылося. Паспрабуй адразу зразумець: чаму іх няма?

З ВОПЫТАМ І ЗА ВОПЫТАМ ЗВЯРТАЙЦЕСЯ ДА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ЗАВОЧНАГА «КРУГЛАГА СТАЛА» ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ». ДА РАЗМОВЫ АБ СТУДЭНЦКІМ САМАКІРАВАННІ МЫ ЗАПРАШАЕМ УСІХ ЗАЦІКАЎЛЕНЫХ ЛЮДЗЕЙ. ЧАКАЕМ ІДЭЙ, СУМНЕННЯЎ, ПЫТАННЯЎ.

Беларускі універсітэт тэлетайп

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

АБ УКЛАДЗЕ МОЛАДЗІ

ў перабудову, аб справах і клопатах камсамола, месцы і ролі нефармальных маладзёжных арганізацый ішла размова на сустрэчы з сакратаром ЦК ЛКСМБ М. В. Падгайным, якая адбылася ў рамках адзінага палітдня на механіка-матэматычным факультэце.

Ж. МІХАЙЛАВА.

ПАШЫРЫЦЕ СВОЙ КРУГАГЛЯД

і даведаецеся шмат цікавага, пабываўшы на лекцыі «Бірма: людзі, рэлігія, архітэктура старажытнасці і нашых дзён», якую сёння ў 14 гадзін 30 мінут прачытае ў актавай зале галоўнага корпуса В. А. Ушакоў (Масква).

Ч. ВІКТАРАЎ.

ЧАРГОВЫ ТЭАТРАЛЬНЫ СЕЗОН

(63-ці па ліку) Кіеўскі тэатр юнага гледача імя Ленінскага камсамола адкрыў гастролямі ў Маскве і Маскоўскай вобласці, прадставіўшы на суд гледача амаль увесь свой рэпертуар. А працягне яго — у Мінску. Аматары тэатральнага мастацтва змогуць пазнаёміцца са спектаклямі «Заўтра была вайна» па аповесці і п'есе Барыса Васільева, які зусім нядаўна стаў дыпламантам Рэспубліканскага агляду, прысвечанага 70-годдзю Вялікага Кастрычніка, «Каханне, джаз і чорт» па п'есе літоўскага драматурга Ю. Грушаса, «Лясная песня» Лесі Украінкі — уладальнікам трэцяй прэміі на 2-м Рэспубліканскім фестывалі», «Кароль Драздабарод», «Ракавая памылка», «А ўсё-такі яна верціцца?..» і іншымі. У сталіцы Беларусі тэатр прабудзе з 28 красавіка па 25 мая.

З. МІХНЕВІЧ.

ПРАПАНУЮ СПРАВУ!

Хутка вы ўбачыце

ЯК НАПІСАЦЬ нарыс ці правесці радыёрэпартаж, стварыць фотасюжэт, звярстаць нумар газеты? Гэтаму вучаць сёння студэнтаў факультэтаў журналістыкі. Прыкмета часу — работа будучых журналістаў за пультамі тэлецэнтра. Вучэбны тэлецэнтр нашага факультэта пачаў працаваць дзесяць гадоў назад. Тады ўсё абсталяванне складалася з адной кінакамеры і манітора. А сёння існуюць ужо сістэма каляровага тэлебачання, відэатэрмінал, спецыяльныя мантажныя пульты. Гэта дае шырокія магчымасці для авалодвання навыкамі работы інжынера, гуказапісу, рэжысёра, тэлеаператара, рэдактара, вядучага тэлеперадач. З'явілася магчымасць для навучання выканання тэлемантажу (найбольш працаёмкага, творчага працэсу ў тэлежурналістыцы).

Аснашчэнне тэлецэнтра сёння дазваляе студэнтам падрыхтоўваць як індывідуальныя, так і групавыя перадачы. Для ўдзелу ў іх запрашаюцца прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, маладзёжных клубаў і аб'яднанняў.

Ідзе перадача. За пультамі працуюць толькі самі студэнты. Яны ж адшукваюць цікавую інфармацыю, ствараюць сцэнарыі. Часам дыскусіі і спрэчкі вядуцца адразу на некалькіх мовах: сярод будучых журналістаў — моладзь з сацыялістычных краін і тых, якія развіваюцца.

Але вось што амаль парадаксальна. Пакуль яшчэ няшмат сюжэтаў з жыцця роднага універсітэта. Хіба ў нас няма чаго паказаць, аб чым расказаць? За вамі слова, будучыя журналісты.

А. ШЭЛЕСТ,
супрацоўнік факультэта журналістыкі.

22 красавіка — дзень нараджэння У. І. Леніна

У ДЗЕНЬ нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна хочацца неяк асабліва сказаць аб яго дзейнасці і спадчыне, яго асобе. Але жыццё Леніна не ўмясціць ні ў якія словы. І лепшы спосаб выказаць нашы пачуцці — справамі і ўчынкамі быць вернымі яго прыкладу, яго запаветам. Такі адзіны крытэрый для кожнага сапраўднага ленінца.

Ленінскім дням ва універсітэце прысвечаны дні факультэтаў, якія праходзяць зараз, студэнцкія навуковыя канферэнцыі, суботнікі. У дзень нараджэння У. І. Леніна адбудзецца мітынг, які адкрыюць і будуць вясці студэнты і выкладчыкі механіка-матэматычнага факультэта, аднаго з пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва за 1987 год.

— У гэты дзень мы ўскладзём кветкі да помніка правадыру, — гаворыць намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце М. Э. Часноўскі. — Гэта — наш святы абавязак, бо БДУ носіць імя У. І. Леніна.

Не, гэта не рытуал, не даніна традыцыі. Гэта — пераканаўчы прыклад таго, што ідэі Леніна жывуць і перамагаюць.

Камсорг трымае справаздачу

ПЕРШАЕ, УПЕРШЫНЮ

З 26 ЛЮТАГА ПА 23 САКАВІКА 1988 ГОДА АРГАНІЗАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ КАМІТЭТА КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА ЎПЕРШЫНЮ ПРАВОДЗІЎ ГУТАРКУ З САКРАТАРАМІ КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ АКАДЭМІЧНЫХ ГРУП.

Для многіх сакратароў камсамольскіх арганізацый груп гэта падзея была нечаканай. Таму што да гэтае пары на факультэтах камітэты камсамола мелі звычку працаваць з камсоргамі акадэмічных груп толькі на пасяджэннях школы камсамольскага актыву, якія нярэдка праходзілі ў форме лекцый або нарад камсоргаў. Самі разумееце, што насілі яны ўказальны характар і нават не дапускалі зваротнай сувязі.

Мяркую, толькі тады, калі пытанні камсамольскай работы будуць вырашацца сумесна, можна будзе патрабаваць ад кожнага камсамольца справаздачу аб выкананні статутных абавязкаў, праводзіць вучобу актыву і вырашаць задачы, якія паставіў перад камсамольцамі XX з'езд ВЛКСМ.

А што ж паказала гутарка? Каля 50 працэнтаў сакратароў камсамольскіх арганізацый груп, якія прымалі ў ёй удзел, паказалі добрае веданне форм і метадаў камсамольскай работы ў акадэмічных групах, матэрыялаў XX з'езда ВЛКСМ, 30 працэнтаў — здавальняючае і каля 20 — нездавальняючае.

Есць падстава для роздуму і далейшых дзеянняў.

Б. ЛЫСЯКОЎ,
намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.

Дзе сяброўюць рак і лебедзь

ЗАПРАШАЛЬНЫ БІЛЕТ

Сістэма НТТМ. Гэта кароткая і, магчыма, незразумела. Але, на думку многіх, гучыць прывабна. І карысці з часам прынясе нямала.

А пакуль скептыкі пасміхаюцца, энтузіясты пачуць не паспелі. Для хутчэйшага пераканання першых і неадкладнай дзейнасці другіх пры актыўным удзеле камітэта камсамола універсітэта было створана гаспадарча-разліковае падраздзяленне цэнтра навукова-тэхнічнай творчасці моладзі Савецкага раёна горада Мінска.

Сістэма НТТМ накіравана на актывізацыю і каардынацыю дзейнасці ўсіх дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, якія займаюцца развіццём навукова-тэхнічнай творчасці моладзі. Раней працавалі яны паасобку, выконваючы адну справу, і нагадвалі крылоўскіх лебедзя, рака і шчупака. Нарэшце воз крануўся. Таму што аб'ядналі да гэтай пары дзеючыя безвынікова асобы свае намаганні і сродкі ў мэтах забеспячэння далейшага ўдасканалення ідэйна-палітычнага, працоўнага і маральнага выхавання юнакоў і дзяўчат, павелічэння рэальнага ўкладу ў паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Арганізацыяй, якая забяспечвае навукова-тэхнічную дзейнасць адзінай сістэмы, як вы, пэўна, ужо здагадаліся, з'явіўся цэнтр НТТМ. Яго гаспадарчая дзейнасць будуецца зыходзячы з аб'ёмаў работ па прамых дагаворах з прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі.

Хто тут на галоўных ролях? Творчыя калектывы, што фарміруюцца ў выніку конкурснага адбору. Каб стаць іх членам, дастаткова падаць заяву на імя дырэктара цэнтра НТТМ. А далей — за працу. Зразумела, у вольны ад работы ці вучобы час, бо прымаюцца ў творчыя калектывы вучоныя, спецыялісты, рабочыя, студэнты ВНУ і тэхнікумаў, навучэнцы школ і ПТВ. Праўда, перш за ўсё трэба крытычна ацаніць сябе і выявіць ступень кваліфікацыі і запас творчых здольнасцей для выканання пастаўленай задачы.

І яшчэ. Цэнтр НТТМ садзейнічае універсітэту ў выкананні гаспадарча-дагаворных і дзяржбюджэтных навукова-даследчых работ, вядзе работу па выкананню прамых дагавораў цэнтра.

Запрашаем усіх супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта прыняць актыўны ўдзел у рабоце новага падраздзялення.

З прапановамі звяртайцеся ў аўд. 580-а фізічнага корпуса. Тэл.: 78-49-87 і 5-67, аўд. 418 галоўнага корпуса.

Д. МЯДЗВЕДЗЕЎ,
член камітэта камсамола супрацоўнікаў і выкладчыкаў.

ЕСЦЬ ІНІЦЫЯТЫВА! ХТО ПАДТРЫМАЕ?

ЗАХОЎВАЦЬ І ВЫХОЎВАЦЬ

У АДПАВЕДНАСЦІ з рашэннем Міжнароднага савета па пытаннях помнікаў і славутых мясцін у краінах, якія ўваходзяць у гэту арганізацыю, з 1984 года адзначаецца Міжнародны дзень помнікаў.

Помнікі гісторыі і культуры заўсёды прыцягвалі ўвагу лепшых прадстаўнікоў грамадскасці. 14 мая 1954 года ў Гаазе быў падпісаны Заключны акт і Канвенцыя аб абароне культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту. Гэту канвенцыю ў ліку 56 краін падпісалі СССР, УССР, БССР.

Клопат аб беражлівым захоўванні помнікаў гісторыі і культуры, аб умелым іх выкарыстанні ў ідэалагічнай рабоце з першых дзён Савецкай улады стаў справай дзяржаўнай важнасці. Ленінскія традыцыі беражлівых адносін да гісторыка-культурнай спадчыны захоўваюцца і сёння. Так у Мінску ў гэтым годзе завяршаюцца работы па рэканструкцыі Троіцкага прадмесця. Прыняты рашэнні па рэканструкцыі і аднаўленню Верхняга горада, Кальварыйскіх могілак. Патрэбна адзначыць, што па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле раённых аддзяленняў і многіх пярвічных арганізацый Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры ў мінулым годзе праведзены вялікі аб'ём работы па рэканструкцыі, рамонту і добраўпарадкаванню помнікаў воінскай славы.

У горадзе пачаты рух «Родны горад». Яго мэта — прыцягнуць усіх тых, хто любіць свой горад, каго хвалюе лёс помнікаў, хто хоча ўнесці асабісты ўклад у іх рэстаўрацыю і аднаўленне, да правядзення суботнікаў на Троіцкім і Ракаўскім прадмесцях, Верхнім горадзе, у музеі народнай архітэктуры і быту ў в. Старочыцы, у парках горада. Мы спадзяёмся, што кожны ўнясе практычны ўклад у гэту патрыятычную справу.

Л. ЛІНСКАЯ,
адказны сакратар Мінскага гарадскога савета Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

ПАБУДУЕМ СОНЕЧНЫЯ

Новыя ўмовы гаспадарання... Здаецца, студэнтаў пытанне гэта хвалюе толькі ўскосна. Але варта прыгадаць, што лета, якое ператворыць вас у цесляроў, муляраў, бетоншчыкаў, не за гарамі, і адразу заявіць аб сабе першае «як». Як зараз будуць працаваць студэнцкія атрады? Больш за ўсіх хвалюецца, вядома ж, камандзір. Абраўшы імення гэтую неспакойную пасаду, наш карэспандэнт пачаў гутарку з намеснікам камандзіра Мінскага абласнога штаба студэнцкіх атрадаў Міхаілам ДРАЧАНОМ:

ДАЗВОЛЬЦЕ ДАВЕДАЦЦА

АТРАДЫ НА ПАДРАДЗЕ

— Крыху мінулагодніх непрыемных успамінаў. Прыехаў атрад працаваць на аб'ект. Усе байцы, як на падбор, і камандзір — хлопец талковы, арганізатар выдатны, а да канца семестра так і не адчулі сапраўднай радасці ад карысці сваёй працы: спярша бетон не падвозілі, потым даваліся працаваць ад зёлку да зёлку. Толькі ў канцы даведаліся, што дагаворныя абавязацельствы «на вока» прыкідваліся...

— У гэтай сітуацыі ўсё залежала ад камандзіра. З самага пачатку. Не падрыхтавана адпаведным чынам дакументацыя! Прапануюўваецце такіе паслугі іншай арганізацыі ці патрабуйце ад першай выпрацаванне недахопаў. З'явіліся недакладнасці? Не трэба ленавацца лішні раз сзірнуць у праектна-каштарысную дакументацыю. Атрад мае права адмовіцца ад такіх «гаспадароў». А іншы камандзір? Паставіў подпіс і вачэй ад паперкі, каб зразумець, што будзе далей, адарваць не можа. Ці то ахвоты няма, ці то бясклапотнасць сур'ёзным быць перашкаджае. Тут нявопытнасць ні пры чым — адсутнічае пачуццё адказнасці.

Дагавор падпісваюць абодва бакі. Лягчэй за ўсё спачатку не звяртаць увагі на дробязі ў дакументацыі, а потым ківаць на «дзядзьку» з трэста: паабцалі ж.

— Дарэчы, і сапраўды гісторыя з абяцанкамі-цацанкамі не так ужо рэдка паўтараецца. Абяцаюць прэміраванне, утульнае жыллё, шчодрыя ўмовы і нечуваную зарплату.

— Самае галоўнае, ужо ў падрыхтоўчы перыяд, сур'ёзна адносіцца да дагаворнай кампаніі. Былая сістэма, пры якой указвалісе толькі аб'ект і месца дыслакацыі атрада, безумоўна, патрабуе ўдасканалення. А пакуль існуюць яшчэ былыя бланкі для афармлення дагавора, мы бачым выйсце ў стварэнні спецыяльных укладышаў, дзе адзначаны канкрэтны ўчастак работы атрада, агаворваюцца ўсе віды работ...

— Мне гэта нагадвае ставрэнне яшчэ аднаго бюракратычнага пункціка ў дзейнасці камандзіра, і да таго дастаткова папяровай.

— Гаворка не аб бюракратызацыі — ад канкрэтызацыі. Раней прыязджаў атрад працаваць, і яго накіроўвалі на падсобныя работы, быццам і розніцы ніякай няма: аб'ект той жа. І жыллёвыя ўмовы. Дастаткова было на словах паабяцаць будынак школы, і даверлівыя «камандзіры» згаджаліся, а толькі потым ужо даведваліся аб летнім рамонце.

— І ўсё ж і ў новых умовах застаюцца работы таныя і дарагія...

— Так, але атрад атрымлівае пэўны ўчастак работы. Як самастойная брыгада. І працуе калі не ад фундамента да даху, дык ад пачатку да канца, якія вызначаны ў дагаворы. Ён адзін адказвае за свой аб'ект. Таму асаблівай розніцы паміж асноўнымі і падсобнымі работамі не існуе. Даводзіцца заданне, выдзяляецца працэнт адлічэння заработнай платы. І калі раней можна было, перакідаўшыся, нешта прыпісаць, што часам і рабіла прымаючая арганізацыя, шкадуючы студэнтаў ці пакрываючы недахопы ў арганізацыі працы, зараз механізм прыпісак не ўзрушыш. Таму што, адразаючы неадпрацаваны кусок студэнтам пры даведзеным пастаянным нарматыве адлічэння зарплаты, адміністрацыя вымушана абкрадваць уласных рабочых.

— А калі атрад не разлічыць сваіх сіл, не паспее выканаць заданне?

— Атрымае менш грошай. Нарэшце удалося паменшыць колькасць атрадаў, што працуюць у сістэме дзяржаўнага будаўніцтва.

— На гэта былі якія-небудзь прычыны?

— А як жа. Нізкія заробкі. І амаль пастаянная блытаніна з забеспячэннем работай. Прапаноўваюць у асноўным другарадныя работы. Але ёсць і другая праблема: не кожны атрад мае магчымасць працаваць у арганізацыі гаспадарчага спосабу. Як правіла, для работы ў будаўніцтве жыллё, аб якіх сацыкультбыту патрабуюцца высокакваліфікаваныя спецыялісты. Праўда, у мінулым годзе некалькі атрадаў працавала ў нас на ўмовах падобнага эксперыменту. Атрымалася, што зарплата была вышэй звычайнай.

Я пераіў бы іншым навучальным установам пераймать вопыт МРТІ, дзе атрады фарміруюцца яшчэ ў лістападзе і таму маюць магчымасць папрацаваць не месяцы дыскваліфікаві ўжо ў час зімовых канікулаў. Таму і маральны клімат, і прафесійная падрыхтоўка байцоў нас звычайна радуе.

— А як наконт універсітэцкіх атрадаў?

Вызначаны састаў камандзіраў. Васіль Бойка, старшыня штаба працоўных спраў, упэўнены, што атрады канцінейшыя за мінулагоднія. Надзвычайныя пытанняў пакуль не паўстае.

Упершыню апынуўся ў будатрадзе ў час апошніх школьных летніх канікулаў. У атрадзе БПІ нас было трое — такіх вось, на першы погляд, байцоў-немаўлят. Астатнія добра недалі адзін аднаго і многае, так нам здавалася, пабачылі ў жыцці. Але ў адносінах да нас гэтай розніцы ў гадах мы не адчулі.

НЕ ПА ЧУТКАХ

Пра ТБ і не толькі

Так мы і пазнаёміліся: я і будатрад. З тае пары і праводжу ў штармоўцы кожнае лета. Што больш за ўсё прывабліве? Не толькі магчымасць зарабіць грошай. Уявіце сабе: два семестры, дзевяць месяцаў у год галоўнымі інструментамі з'яўляюцца для студэнта кніга, сшытак, ручка. Канкратныя вынікі існуюць толькі ў выглядзе канспектаў і аднак у залікоўцы. Складаецца ўражанне, што мы набываем веды для сябе і нічога не аддаём другім. Тым больш прыемна падбадзваць разам з сябрамі за лета дом ці іншы аб'ект.

У гэтым годзе я ўпершыню буду працаваць інжынерам па тэхніцы бяспекі. Ведаю адносіны студэнтаў да ўсіх правіл і забарон, таму галоўнае для мяне — пераканаўча растлумачыць ім, што вымучаць правілы трэба загадзя, каб не прывяло іх парушэнне да нешчасных здарэнняў.

А пакуль рыхтуюся да экзаменаў па тэхніцы бяспекі. Спадзяюся, што з усёй сур'ёзнасцю адносяцца да іх і ўсе байцы.

Д. МУЛІЦ.

СЛОВА АБ АТРАДЗЕ

Рамантыка мінус ... мары

— ГЭТЫМ летам атрад зноў едзе да Байкала...

У мінулым годзе хлопцаў і дзяўчат са студэнцкага атрада «Кастрычнік» тут сустрэлі вельмі радушна: падрыхтавалі мітынг, канцэрт, забяспечылі выдатным жыллём, стварылі аптымальныя ўмовы для ўдарнай працы.

— Кожны дзень мы строга прытрымлівалі наступнага: пад'ём, лінейка, праца і, зразумела, добрае харчаванне. Гэта, калі хочаце, складзеная посценку,— расказвае камандзір Аляксандр Ходзікаў.— Вельмі важна яшчэ, каб байцы заўсёды былі разам: і працавалі, і адпачывалі.

— Так, але атрад атрымлівае пэўны ўчастак работы. Як самастойная брыгада. І працуе калі не ад фундамента да даху, дык ад пачатку да канца, якія вызначаны ў дагаворы. Ён адзін адказвае за свой аб'ект. Таму асаблівай розніцы паміж асноўнымі і падсобнымі работамі не існуе. Даводзіцца заданне, выдзяляецца працэнт адлічэння заработнай платы. І калі раней можна было, перакідаўшыся, нешта прыпісаць, што часам і рабіла прымаючая арганізацыя, шкадуючы студэнтаў ці пакрываючы недахопы ў арганізацыі працы, зараз механізм прыпісак не ўзрушыш. Таму што, адразаючы неадпрацаваны кусок студэнтам пры даведзеным пастаянным нарматыве адлічэння зарплаты, адміністрацыя вымушана абкрадваць уласных рабочых.

— А калі атрад не разлічыць сваіх сіл, не паспее выканаць заданне?

— Атрымае менш грошай. Нарэшце удалося паменшыць колькасць атрадаў, што працуюць у сістэме дзяржаўнага будаўніцтва.

— На гэта былі якія-небудзь прычыны?

— А як жа. Нізкія заробкі. І амаль пастаянная блытаніна з забеспячэннем работай. Прапаноўваюць у асноўным другарадныя работы. Але ёсць і другая праблема: не кожны атрад мае магчымасць працаваць у арганізацыі гаспадарчага спосабу. Як правіла, для работы на будаўніцтве жыллё, аб якіх сацыкультбыту патрабуюцца высокакваліфікаваныя спецыялісты. Праўда, у мінулым годзе некалькі атрадаў працавала ў нас на ўмовах падобнага эксперыменту. Атрымалася, што зарплата была вышэй звычайнай.

Я пераіў бы іншым навучальным установам пераймать вопыт МРТІ, дзе атрады фарміруюцца яшчэ ў лістападзе і таму маюць магчымасць папрацаваць не месяцы дыскваліфікаві ўжо ў час зімовых канікулаў. Таму і маральны клімат, і прафесійная падрыхтоўка байцоў нас звычайна радуе.

— А як наконт універсітэцкіх атрадаў?

Вызначаны састаў камандзіраў. Васіль Бойка, старшыня штаба працоўных спраў, упэўнены, што атрады канцінейшыя за мінулагоднія. Надзвычайныя пытанняў пакуль не паўстае.

ЛЮДЗЯМ ГАРАДЫ

...У той дзень у атрадзе адбылося надзвычайнае здарэнне. Ушёк «цяжкі» падлетак. Дакладней, гаворачы словамі камандзіра, «зрабіў спробу». Таму што затрымаў Юрку ўчастковы міліцыянер і, пазнаўшы «прыёмыша» студэнтаў, хутка даставіў яго ў атрад.

Бясплатны дадатак

— І адкуль зваліўся такі на нашы галовы?

Камандзір кінуў асуджальны позірк на камісара:

— У мяне іншых клопатаў хапае. Некалі ў дзіцячы сад гуляць. (Заўважу: вучыцца наш камандзір на педагагічным патоку і праз год-два збіраецца працаваць у школе).

ЛЕГКІЯ «ЦЯЖКІЯ»

«Усё роўна» ці «на роўных»

На «дзіцячы сад» Юрка не пакрыўдзіўся. Што зробіш, ростам не ўдаўся, шчуплянькі, ну зусім як шасцікласнік. Але працаваць ён таксама хацеў. Да таго ж знёмыя хлопцы гаварылі, што студэнты не пакрыўдзяць, а калі што-небудзь не атрымаецца — навучаць. Мабыць, яны памыліліся, бо калі ставілася пытанне, каго ж абраць шэфам, усе зрабілі выгляд, што Юрку не заўважаюць, імкнучыся разысціся па сваіх справах.

Апынуўся Юрка ў становішчы адрэзанага куска ў атрадзе. Важдацца з ім нікому не хацелася: камандзір прапанаваў звяртацца да шэфа. Той ківаў на камісара, а простым байцам і наогул ніякай справы да «цяжкага» не было: на спрэчкі ж з майстрам з-за кожнай капейкі марнавацъ час яны не шкадавалі. Працаваць яго паставілі на ўборку смецця. Пасля працоўнага дня ўсе збіраліся ў штабе, спявалі песні пад звон гітары, на яго ж забывалися. З ім нават не «размаўлялі, акрамя «падай», «прыняся», «прыбяры». Падаваў, прыносіў, прыбіраў, а аднойчы абурыўся:

— Колькі можна! Я працаваць прыехаў, разумееце? Па-сапраўднаму.

Дарослыя, упэўненыя ў сабе і ў правільнасці сваіх учынкаў людзі, замест таго, каб зразумець хлопчыка, паступова адыходзілі ўсё далей. Будатрадаўская форма не зрабіла Юрку «лягчэйшым». Так не бывае. Але адчуць, што існуе іншае жыццё, другія каштоўнасці і людзі, што могуць і, галоўнае, жадаюць быць з ім роўнымі, хлопчыку так і не давялося.

...Праз некалькі дзён атрад мог жыць спакойна:

— Па рашэнню сходу адправілі Юрку у другі атрад,— адказаў за ўсіх камандзір і дадаў:— Ён сам папрасіўся.

Вы лічыце, ён што-небудзь зразумеў?

Адкрыцці Пашкі Шуцеева

— Чаму ты прыехаў у будатрад?

Пашка, скаланўўшыся і разглядваючы нейкую трэшчыну ў падлозе, адказаў:

— Каб не ведаць, што ў гэтым годзе я ўпершыню буду працаваць інжынерам па тэхніцы бяспекі. Спадзяюся, што з усёй сур'ёзнасцю адносяцца да іх і ўсе байцы.

Д. МУЛІЦ.

...Праз некалькі дзён атрад мог жыць спакойна:

— Па рашэнню сходу адправілі Юрку ў другі атрад,— адказаў за ўсіх камандзір і дадаў:— Ён сам папрасіўся.

Вы лічыце, ён што-небудзь зразумеў?

Адкрыцці Пашкі Шуцеева

— Чаму ты прыехаў у будатрад?

Пашка, скаланўўшыся і разглядваючы нейкую трэшчыну ў падлозе, адказаў:

— Каб не ведаць, што ў гэтым годзе я ўпершыню буду працаваць інжынерам па тэхніцы бяспекі. Спадзяюся, што з усёй сур'ёзнасцю адносяцца да іх і ўсе байцы.

Д. МУЛІЦ.

«КРУГЛЫ СТОЛ» ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»

Лета кліча ў будатрад

СЕЛЕТА ДЗЕСЯТКІ УНІВЕРСІТЭЦКІХ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ РАЗ'ЕДУЦЦА Ў РОЗНЫХ НАПРАМКАХ. ШТО ПРЫНЯСЕ ІМ ПРАЦА: РАДАСЦЬ, ЗАДАВАЛЬНЕННЕ ЦІ НЯЎДАЧУ І РАСЧАРАВАННЕ? АД КАГО ГЭТА ЗАЛЕЖЫЦЬ? ЧАГО ЧАКАЮЦЬ СТУДЭНТЫ АД ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА? ЯКІМ БАЧАЦЬ ЯГО?

ГЭТЫЯ І ІНШЫЯ ПЫТАННІ БУДАТРАДАЎСКАГА ЖЫЦЦЯ ВЫКЛІКАЛІ ГАРАЧЫЯ СПРЭЧКІ СЯРОД УДЗЕЛЬНІКАЎ «КРУГЛАГА СТАЛА» РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ». СВАЕ ДУМКІ І МЕРКАВАННІ ВЫКАЗАЛІ І. ВЯРЭНЧЫКАЎ — КАМАНДЗІР ЗАНАЛЬНАГА ШТАБА БЕЛАРУСІ Ў ІРКУЦКАЙ ВОБЛАСЦІ; В. БОЙКА — НАЧАЛЬНІК ШТАБА ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА; А. ГОПКА — ВЫКЛАДЧЫК ПА ТЭХНІЦЫ БЯСПЕКІ, НАВУКОВЫ СУПРАЦОЎНІК ФПМ; У. СЕМЯНЬКОЎ — БАЕЦ СА «ВІЦЯЗЬ»; Э. САПЕГА — МАЙСТАР СА «РЫТМ»; Ю. МАРЦІНОВІЧ — НАЧАЛЬНІК ШТАБА ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ ФІЗФАКА; С. ГУРСКІ — БАЕЦ СА «РЫТМ»; В. МАЦЮКОЎСКІ — КАМАНДЗІР ВУЧЭБНА-НАВУКОВА-ВЫТВОРЧАГА АТРАДА «БРАМА»; А. ЧАШЭВІЧ — КАМІСАР СА «РЫТМ».

КАР.: Напэўна, мае сэнс пачаць нашу гутарку з падрыхтоўчага перыяду. Ад яго ў многім залежаць вынікі работы.

Э. САПЕГА: Адразу хачу запярэчыць: не ў многім, а поўнасцю. Пераканаўся на ўласным вопыце: які атрад сфарміруеш, як навучыш яго, такой будзе і работа. Без высокай прафесійнай падрыхтоўкі і добрага маральнага клімату ў калектыве атрад не атрад. Калі адносіны ў калектыве шчырыя, тады і работа ідзе спарней. У гэтым плане добра зарэкамендавалі сябе атрады, створаныя на базе груп ці курсаў. За час вучобы студэнты ўжо паспелі здружыцца, бліжэй пазнаёміцца, словам, прыцірка характараў адбылася.

А. ЧАШЭВІЧ: Часта пры фарміраванні атрадаў выкарыстоўваецца так называемы метад перацягвання каната. Старацюцца перамяшаць тых, хто ўжо мае вопыт работы. Гэта прыводзіць да таго, што адны атрады моцныя (я маю на ўвазе прафесійны бок, бо маральны клімат у такіх калектывах не на вышэйшым узроўні: як жа, усе кундэркінды сябраліся), а другія — пакуль навучацца класці цэглу ці мяшаць бетон, трэба ехаць дамоў.

Э. САПЕГА: Адна з заган падрыхтоўчага перыяду — папяровая валакіта. Навошта, скажам, аж чатыры ведамасці па тэхніцы бяспекі?

І. ВЯРЭНЧЫКАЎ: Я не згодзен з табой. Папер не так ужо і многа. Што датычыць данай ведамасці, то тут размова ідзе аб жыцці і здароўі людзей.

Журнал медпадрыхтоўкі адлюстроўвае здароўе байцоў. Пры размеркаванні работы мы павінны перыядычна заглядваць у яго.

Часам студэнты скардзяцца на тое, што, як малым, робяць прышчэпкі. Памятаю адзін выпадак. Неяк у атрадзе адбылося «незвычайнае здарэнне»: карэйцу ў сгрупе залез клешч. Як толькі яго ні цягні: і рукамі, і абцугамі спрабавалі. Ускіпяцілі, нават пяцярпеўшы не ведаў, што рабіць: баяўся, што клешч энцыфалітны (супраць гэтай хваробы яму давялося вытрывацъ аж тры прышчэпкі). На шчасце, усё абышлося добра.

У. СЕМЯНЬКОЎ: Магчыма, ёсць сэнс скарацiць колькасць папер для атрадаў, якія добра зарэкамендавалі сябе і маюць стойкія традыцыі, а таксама тым, хто ездзіць адным саставам не першы год.

КАР.: Мы закранулі пытанне аб прафесійнай падрыхтоўцы байцоў. Як вы лічыце, ці на дастатковым узроўні яна вядзецца?

І. ВЯРЭНЧЫКАЎ: Няма практыкі — вось што дрэнна. Я, напрыклад, не ўяўляю, як можна на словах навучыць класці цэглу ці тынкаваць. Ці не праслей было б тынкоўшчыку высокага разраду спачатку пазнаёміць са сваёй прафесіяй, а потым даць студэнтам магчымасць папрацаваць самастойна. Тады і карысць была б большая.

В. БОЙКА: Зараз мы заключаем дагавор аб прафесійнай падрыхтоўцы з ГПТВ № 25 і № 55. Пры падпісанні яго размова якраз ідзе аб тым, каб даваць байцам не толькі тэорыю, але і практыку.

Э. САПЕГА: У многіх студэнтаў, хто раней быў у атрадзе, ёсць пасведчанні муляраў, бетоншчыкаў, спрапальшчыкаў. І ўсё роўна яны кожны год праходзяць прафпадрыхтоўку. Я прапаную зрабіць так, каб пасведчанне было сапраўдным, напрыклад, на гады вучобы.

КАР.: Безумоўна, прапанова слушная. Толькі без пастаяннай практыкі кваліфікацыя панізвецца. А гэта ўжо пагражае тэхніцы бяспекі.

Э. САПЕГА: Я не сказаў, што мы не павінны праходзіць інструктаж па ТБ. І не толькі праслухаць яго і паставіць свой подпіс супраць прозвішча ў журнале. Але часам здаецца, што інструкцыі складзены так, быццам мы ездзем у атрад толькі дзень і ноч працаваць і ні ў якім разе не адпачываць. Лета, цяпло, сонца — і табе ні пазагарацъ (у шортах і майцы працаваць не дазваляюць), ні пакупацца.

КАР.: Мы закранулі пытанне аб прафесійнай падрыхтоўцы байцоў. Як вы лічыце, ці на дастатковым узроўні яна вядзецца?

І. ВЯРЭНЧЫКАЎ: Няма практыкі — вось што дрэнна. Я, напрыклад, не ўяўляю, як можна на словах навучыць класці цэглу ці тынкаваць. Ці не праслей было б тынкоўшчыку высокага разраду спачатку пазнаёміць са сваёй прафесіяй, а потым даць студэнтам магчымасць папрацаваць самастойна. Тады і карысць была б большая.

В. БОЙКА: Зараз мы заключаем дагавор аб прафесійнай падрыхтоўцы з ГПТВ № 25 і № 55. Пры падпісанні яго размова якраз ідзе аб тым, каб даваць байцам не толькі тэорыю, але і практыку.

Э. САПЕГА: У многіх студэнтаў, хто раней быў у атрадзе, ёсць пасведчанні муляраў, бетоншчыкаў, спрапальшчыкаў. І ўсё роўна яны кожны год праходзяць прафпадрыхтоўку. Я прапаную зрабіць так, каб пасведчанне было сапраўдным, напрыклад, на гады вучобы.

КАР.: Безумоўна, прапанова слушная. Толькі без пастаяннай практыкі кваліфікацыя панізвецца. А гэта ўжо пагражае тэхніцы бяспекі.

Э. САПЕГА: Я не сказаў, што мы не павінны праходзіць інструктаж па ТБ. І не толькі праслухаць яго і паставіць свой подпіс супраць прозвішча ў журнале. Але часам здаецца, што інструкцыі складзены так, быццам мы ездзем у атрад толькі дзень і ноч працаваць і ні ў якім разе не адпачываць. Лета, цяпло, сонца — і табе ні пазагарацъ (у шортах і майцы працаваць не дазваляюць), ні пакупацца.

КАР.: Зараз усё часцей і часцей нараканъць, што ў студэнтаў няма таго энтузіязму, які быў раней, а ў студэнцкіх атрадаў даводзіцца загадзя чуць не сілай (статыстыка сведчыць, што з 500 студэнтаў толькі каля 400 падаюць заявы добраахвотна). І як вы думаеце, у чым тут прычына: дрэнныя умовы працы, прастоі, нізкая зарплата? А магчыма, узровень зарплаты бацькоў высокі?

В. БОЙКА: Не, не тое, і другое. Зразумела, што калі студэнт прыязджае ў атрад і сутыкнуўся з нядбайнымі, абыякавымі адносінамі «гаспадароў», перакананы, што ён там не надта патрэбны, то наступны год ён ў студэнцкі атрад не заманіш ніякімі напоямі. Ды яшчэ і сябрам раскажа аб «прыёмах». Нагул, прапаганда будаўнічага руху вялізная ад самых студэнтаў. Што датычыць зарплаты бацькоў, то гэта таксама з'яўляецца прычынай нежадання ехаць працаваць: не лепш патрэбна на сонейку адпачываць на беразе Чорнага мора.

А энтузіязм ёсць і заўсёды. Праста мы даўно вучыліся яго заўважаць і правільна яго накіраванае. Мяркуйце самі: у гэтым годзе запланавана 65 атрадаў, а ўжо сфарміравана 75.

КАР.: План усё ж дасягнуты?

І. ВЯРЭНЧЫКАЎ. Як жа інакш? Напрыклад, у БДУ захацелі б сфарміраваць 100 атрадаў. І куды мы іх дзенем? Для таго, каб забяспечыць студэнтаў фронтам работ, мы ідзем, і вядзецца ўлік заявак прадпрыемстваў арганізацый, якія потым размеркаванне паміж установамі. План — гэта верхняя мяжа таго, што могуць прыняць на месцах. Калі ж дагаварак не хопіць, то атрад, які ні ў якім разе нельга прымушаць. Карысці з гэтага не будзе ніякому.

КАР.: Неяк у размове са студэнтамі давялося пачуць: ці варта студэнцкім атрадам будаваць кароўнікі, даны ці іншыя аб'екты? Ці не лепш было б займацца зборанем музейных экспанатаў, этнаграфіяй, растаўрацыяй помнікаў культуры, архітэктуры? Гэта ж духоўнае будаўніцтва.

В. МАЦЮКОЎСКІ: Рэстаўрацыя помнікаў, вядома, карысная справа. Толькі нельга супрацьпастаўляць адно другому, бо ўсё аднолькава неабходна. У БДУ таксама створаны студэнцкі атрад рэстаўрацыйна-археалагічнага напрамку — «Брама» (у Мінску на рэстаўрацыі горада працуюць толькі пяць такіх атрадаў, у той час як у Таліне, Рызе, Вільнюсе іх дзесяткі). Заўважу, што не кожны можа быць байцом такога атрада: для гэтага патрэбна добра ведаць сваю гісторыю і асабліва таго аб'екта, на якім працуеш. У мінулым годзе «Брама» налічвала ўсяго 20 чалавек, а сёння фарміруюцца ўжо два атрады па 45. Такія СА называюць яшчэ вучэбна-навукова-вытворчымі.

КАР.: Сёння пра вучэбна-навукова-вытворчыя атрады шмат гавораць. Падлічана, што ў цэлым па краіне па абранай спецыяльнасці працуюць каля 180 тысяч студэнтаў. Адны лічаць, што гэта добрая практыка, другія — што такія атрады фармальныя.

В. МАЦЮКОЎСКІ: Упэўнены: за такімі атрадамі будучыня. Студэнты-гісторыкі, працуючы ў «Брама», маюць магчымасць пабываць ва ўсіх куточках нашай краіны, бліжэй пазнаёміцца з абранай спецыяльнасцю. У будучым мы будзем займацца не толькі раскопкамі, а пашырым формы сваёй дзейнасці. У прыватнасці, думаем рыхтаваць і чытаць лекцыі, праводзіць экскурсіі.

...НАША РАЗМОВА НЕ АБМЕЖАВАЛАСЯ ТОЛЬКІ ГЭТЫМІ ПРАБЛЕМАМІ. БЫЛІ ВЫКАЗАНЫ ЦІКАВЫЯ МЕРКАВАННІ АБ ПРАВЯДЗЕННІ ДЗЕН УДАРНАЙ ПРАЦЫ, УЗНЯТА ПЫТАННЕ АБ ТЫМ, КУДЫ ІДУЦЬ ЗАРОБЛЕНЫЯ Ў ГЭТЫЯ ДНІ ГРОШЫ І НА ШТО ХАЦЕЛІ Б ТРАЦІЦЬ ІХ САМІ СТУДЭНТЫ, АБ ПРЫНЦЫПАХ РАЗМЕРКАВАННЯ МЕСЦ ДЫСЛАКАЦЫІ АТРАДАЎ І АБ ТЫМ, ЯК ГЭТА РОБІЦЦА, НАПРЫКЛАД, У МІНСКІМ РАДЫЁТЭХНІЧНЫМ ІНСТЫТУЦЕ (ЛЕПШЫЯ МЕСЦЫ ДАЮЦЦА ТЫМ, ХТО ВЫШЭЎ ПЕРАМОЖЦАМ ПА ВЫНІКАХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ЗА ПАПЯРЭДНІ ПРАЦОЎНЫ ПЕРЫЯД). ВЫКАЗАНА ШМАТ ПРЭЗЯЎНЫХ І ДА ПРЫМАЮЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ (ШКАДА, ШТО НЕ ЧУЛІ ІХ ПРАДСТАЎНІКІ).

І ЎСЕ Ж, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ЎСЕ АДМОЎНЫЯ МОМАНТЫ, НАСТРОЙ Ў НАШЫХ СУБЯСЕДНІКАЎ АПТЫМІСТЫЧНЫ.

Матэрыялы «круглага стала» да друку падрыхтавала З. АЛЯШКЕВІЧ, дапамагалі Н. БАХІР, Г. ПРЫГАРА, студэнткі факультэта журналістыкі.

АМАЛЬ СУР'ЁЗНА

Увага! Ініцыятыва!

Улічваючы ўзрастаючую колькасць дарожна-транспартных здарэнняў па віне пешаходаў, якія не прытрымліваюцца правілаў дарожнага руху, Дзяржаўтаінспекцыя Маскоўскага РАУС прапануе ўсім парушальнікам стаць удзельнікамі новага клуба аматараў вострых адчуванняў на дарозе пад назвай «Ціхія парушальнікі». Заявы і першыя членскія ўзносы можна здаць у пакоі № 75 па вуліцы Бабруйскай, 9. Усе прынятыя ў клуб будуць падзелены на некалькі груп у залежнасці ад асабістых звычак і паводзін у той ці іншай дарожнай сітуацыі.

«Ціхія парушальнікі»

Пакуль ёсць падставы для ўтварэння дзвюх груп: няскмелых парушальнікаў, якія робяць толькі першыя крокі ў пераадоленні дарогі насупраць усім правілам, і групы ініцыятыўных, для якіх парушыць правілы ДР — раўназначна асабістаму спартыўнаму дасягненню. Ёсць факты і думкі лічыць, што даная справа перспектыўная і яе ўжо час ставіць на навуковую аснову. Хуткае закрыццё клубу не пагражае. Мяркуйце самі. За два месяцы бягучага года парушылі ПДР 19 489 пешаходаў. Па іх віне адбыліся 33 дарожна-транспартныя здарэнні. У выніку чаго 1 чалавек загінуў, 33 лечацца ў бальніцах. У значнай ступені дзякуючы менавіта студэнтам і супрацоўнікам БДУ мы маем такія высокія паказчыкі ў цэлым: за тры месяцы 1988 года імі зроблена больш ста парушэнняў.

Арганізатары клуба без усялякіх праверак і бюракратычнай цяганіны прымуць у члены такіх малайцоў, як С. Крывіцкая (III курс, філфак), Э. Дзегцярэнка (IV курс, геафак), А. Гамолка (IV курс, геафак), М. Ахмелава (V курс, фізфак), Ю. Якімаў, М. Нявараў (II курс, факультэт радыёфізікі і электронікі).

Цяпер, калі яны ўступяць у клуб аматараў вострых адчуванняў, ім гарантуецца аўтаматычнае пазбаўленне ад шматлікіх клопатаў. Пры чарговым парушэнні дастаткова толькі прад'явіць свой членскі білет і пытанняў з боку міліцыі і з боку адміністрацыі універсітэта не ўзнікне. Таму спяшайцеся запісвацца ў наш клуб — чакае жыццё, насычанае вострымі адчуваннямі, незвычайнымі прыгодамі.

Жадаючых чакаем штодзень ад 9 да 18 гадзін, акрамя суботы, нядзелі, цотных і няцотных дзён. Можна падаваць калектыўныя заяўкі.

Адміністрацыя клуба «Ціхія парушальнікі», галоўны пісака А. МАКСІМАЎ.

ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ АДПАЧЫНКУ

Шэсце завяршылася трыумфам

Амаль тыдзень працягвалася свята замежнай літаратуры на філалагічным факультэце. Я не агаварыўся, назваўшы тое, што адбывалася, святам, бо за гэтыя дні многія студэнты не толькі адкрылі для сябе шмат новага, цікавага і карыснага ў творчасці замежных пісьменнікаў і паэтаў усіх часоў, але і па-сапраўднаму змаглі палюбіць прадмет.

— Дні замежнай літаратуры прайшлі цудоўна і, галоўнае, весела, захапляюча, яны застануцца ў маёй памяці на доўгія гады,— такі адказ я атрымаў з аўдыторыі «Сямёра супраць фіў» ад Уладзіміра Куліковіча, студэнта другога курса. Увогуле, увесь факультэт жыў мінулы тыдзень то ў атмасферы антычнасці, калі на яго паверхах панавалі, у літаральным сэнсе слова, старажытнагрэчаскія багі і іншыя героі міфалогіі; то раптоўна ператвараўся ў сярэдневяковы свет, а то бурліў і бунтаваў, як у часы Адраджэння.

І, нарэшце, завяршылася трыумфальнае шэсце не менш трыумфальным вечарам.

Прасторная актавая зала факультэта была запоўнена. Але з пачаткам марудзілі. Раптам... галовы гледачоў павярнуліся ў бок уваходу. Адтуль паважна, як і належыць служыцелям навукі, апранутыя ў чорныя мантыі, у адмысловых чатырохвугольных каўпаках на высока паднятых галовах горда ішлі вучоныя мужы: выкладчыкі і выкладчыцы кафедры замежнай літаратуры філфака. Іх і чакалі да адкрыцця ўрачыстасці. І вось, цытуючы дакладна вядучых вечара, «Эпізодый першы!»

XXI стагоддзе, дзе сучасны студэнт разглядаецца ў якасці музейнага экспаната. Побач — яго асабістыя рэчы, вечныя спадарожнікі: канспекты (некаторыя яшчэ не расшыфраваны даследчыкамі), падручнікі, пакрамсаныя ў час сесіі, і «хытрыя» шпаргалкі. Потым ідзе даўно знаёмы актуальны сюжэт — здача экзамена па замежнай літаратуры. Самая цікавая акалічнасць: у гэтай сцэне прымаюць удзел... выкладчыкі. Роля для іх зручная, не новая, аднак тут ад іх патрабавалася шмат артыстычных здольнасцей. Так, усе зразумелі, што яны не толькі выдатныя знаўцы свайго прадмета, строгія і прынцыповыя экзаменатары, але і неблагія акцёры. Праўда, у далейшым іх паслугі ў гэтай галіне не спатрэбіліся, за выключэннем вядучых Г. В. Сінілы і С. У. Логіша, усе астатнія занялі пачэсныя месцы ў зале. Ініцыятыву на сцэне захапілі студэнты. Адзін за адным мяняюцца ўрыўкі з жыцця студэнтаў розных часоў і эпох, ствараецца такім чынам пэўная гісторыя «студэнцкага класа».

Вось калыска старажытнай культуры і навукі — Атыка. Іменна адсюль пайшла сама назва нашага брата — студэнт.

Праз некалькі хвілін дзеянне адбываецца ў Кёльне XII стагоддзя. Карчма, запоўненая шумлівым студэнцкім натоўпам. «Пакуль маладыя — весяліцеся»,— чуецца дэвіз студэнтаў-вагантаў. Толькі гэта не азначала, што вучоба зусім не цікавіла студэнтаў тых часоў і была для іх прахалодай. Наадварот, экзаменатары тады былі куды больш патрабавальныя, а атрымаць ступень магістра (дыплом) было значна цяжэй, чым цяпер. Проста за дзесяць гадоў вучобы (іменна такі быў тэрмін навучання ва універсітэце) студэнтам, відавочна, хапала часу і на вясёлае яго правядзенне. Хоць... Зараз такую магчымасць не ўпускаюць і за пяць гадоў навучання. Сувязь часоў непарыўная, як бачна, студэнт і да нашага часу здолеў захаваць сваю бесклапотнасць.

Доўга апладзіравалі Уладзіміру Куліковічу, які быў цэнтральнай дзеючай фігурай на працягу ўсяго «спектакля» (даруйце за такую ўмоўную назву). Разам з ім прымалі заслужаную падзяку гледачоў У. Караблікаў, Д. Хрол, А. Скарабагатаў, А. Зянкевіч, С. Глебаў, У. Рагойша, У. Баранава, Т. Корзун, В. Корзун, А. Кулібабіна, Б. Паус. Што можна дадаць яшчэ ў іх адрас, акрамя агульнавядомага «Брава!»

Завяршыўся вечар выкананнем старадаўняга студэнцкага гімна «Гаўдэамус». Спявалі яго ўсе, каму пашчаціла прысутнічаць на канцэрце, апынуцца ў свеце мудрага і вечнага, узнёслага і прыгожага, вясёлага і цудоўнага.

М. ДЗЯБЕЛА, студэнт факультэта журналістыкі.

Фота В. НАВУМЕНКІ.

УВАХОД НЕ ЗАБАРАНЯЕЦЦА

Справа для сапраўдных мужчын

— АКАДы існуюць на ўсіх адзінаццаці факультэтах, ва універсітэцкіх інтэрнатах,— расказвае Сяргей Бранцаў,— абслугоўваюць Маскоўскі раён Мінска, дзяжураць ля ПК чыгуначнікаў, у кафэ «Гаўдэамус», разам з супрацоўнікамі Маскоўскага РАУС патрулююць вуліцы.

....У той дзень на вечары ў Палацы культуры чыгуначнікаў дзяжурыў аператыўны камсамольскі атрад дружыны факультэта прыкладной матэматыкі. Ля дзвярэй пачаў паступова збірацца натоўп падпіўшых юнакоў: аганькі цыгарэт, нецэнзурная лаянка, выкрыкі ў бок дзяжурных. Пачалася бойка. Біліся хуліганы з уменнем, са спрытам. Іх было прыкладна ў два разы больш, але ж аператрадаўцы не з баязлівага дзесятка. Хуліганаў затрымалі.

Гэта ўсяго адзін са шматлікіх эпізодаў з жыцця аператыўнага атрада. На мой погляд, ён дастаткова поўна і выразна характарызуе тое, чым кожны дзень даводзіцца займацца членам дружыны.

— У нашай рабоце няма нічога гераічнага,— сказаў мне Барыс Налівайка, камісар АКАДа ФПМ.— Усе нашы хлопцы (25 чалавек) добрасумленна выконваюць свае абавязкі.

Так, АКАД ФПМ — адзін з лепшых. На зімовых канікулах 30 лепшых з 483 членаў АКАДа былі ўзнагароджаны бясплатнай паездкай у Кіеў. Сярод іх і пяць прадстаўнікоў ФПМ. Акрамя Барыса Налівайкі лепшымі былі прызнаны Косця Раптуновіч, Ігар Бачыла, Дзіма Лубешка, Саша Болтуць.

— Амаль усе хлопцы адслужылі ў арміі,— гаворыць Барыс.— А вось Дзіму Лубешку служыць яшчэ давядзецца, але вопыту работы ў аператрадзе яму не пазычаць: у складаных сітуацыях дзейнічае рашуча, смела.

На сходзе камандзіраў аператрадаў я пазнаёміўся з першакурснікам юрыдычнага факультэта Сяргеем Макаранкам, які ўзначальнвае спецыяльны атрад па барацьбе з наркаманіяй і прастытуцыяй. Працаваць у атрадзе вельмі складана і адказна, таму і члены яго — лепшыя з лепшых. Усе выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане.

Задачай спецатрада гаркома і камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна па гасцініцы «Юбілейная» і спецатрада па гасцініцы «Мінск» з'яўляецца барацьба з фарцоўшчыкамі, парушальнікамі прапускной сістэмы, прастытуткамі.

Асобы клопат АКАДа — работа з «цяжкімі» падлеткамі. Гэтым займаецца спецыяльны атрад, які ўзначальвае студэнт IV курса механіка-матэматычнага факультэта Алег Верамейчык. Большасць яго падапечных — умоўна асуджаныя за хуліганствы, крадзеж, іншыя злачынствы, жывуць у сем'ях, у якіх не ўсё добра. Як дапамагчы ім? Усе разумеюць, што фармальна падыходзіць да такой далікатнай справы нельга. Тут патрэбны такт, цярплівасць. Таму і працуюць у атрадзе ў асноўным дзяўчаты. І ўсё ж АКАД — справа мужчынская. Мяркуйце самі. У снежні мінулага года на вечары супрацоўнікаў універсітэта ў Палацы культуры чыгуначнікаў п'яны дэбашыр, жыхар Маскоўскай вобласці, завязаў бойку з членамі аператыўнага атрада юрыдычнага факультэта. Шлях хулігану перагарадзілі Артур Самусенкаў і Віктар Пяткевіч, даставіўшы яго ў міліцыю.

Нядаўна я пабываў у чарговым рэйдзе універсітэцкага АКАДа на тэрыторыі Маскоўскага раёна.

— Вельмі патрэбна дапамога АКАДаў,— сказалі мне супрацоўнікі міліцыі, з якімі атрад факультэта журналістыкі дзяжурыў на Паўднёвым Захадзе.

...Іх часта можна ўбачыць на вуліцах вячэрняга горада, на дыскатэках, у інтэрнатах, каля гасцініц. Сур'ёзныя, заўсёды сабраныя і ўважлівыя. Дапамагаць, забараняць — іх прамы абавязак. Таму што займаюцца яны справай для сапраўдных мужчын.

А. ДЗЯМЕНЦЬЕЎСКІ, студэнт факультэта журналістыкі.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

Залежыць ад саміх студэнтаў?

Матэрыял «Сустрэчны пропуск: панацэя ці памылка?» апублікаваны ў нашай газеце 17 сакавіка гэтага года. Водгукі на яго змешчаны ў мінулым нумары. Нарэшце, атрымалі мы і вось такі адказ ад намесніка старшыні прафкома студэнтаў Г. ПАЦЕКІНА. Друкуем яго без скарачэнняў і змен:

●

«Сёння ўжо ні для каго не сакрэт, што інтэрнат для студэнта на час вучобы становіцца другім домам. І зараз робіцца многае для стварэння ўтульнасці ў інтэрнатах. Многае залежыць ад саміх студэнтаў. Гэта добра відаць ў інтэрнатах, дзе па рашэнню жыхароў уведзена самакіраванне. У гэтым плане заслугоўвае ўвагі вопыт інтэрнатаў № 6 і № 4, які распаўсюджваецца па ўсёй краіне. Значна актывізавалі сваю работу і студсаветы ў інтэрнатах № 1 і № 7. Можна многа гаварыць аб тым, што можа зрабіць студэнцкі калектыў ва ўмовах самакіравання для паляпшэння быту і адпачынку ў інтэрнатах. Але давайце спынімся на інтэрнатах, дзе студэнты застаюцца абыякавымі да стану спраў у сваім доме. Перш за ўсё гэта інтэрнат № 2. На сёняшні дзень гэты інтэрнат мае даволі скандальную вядомасць у горадзе з-за таго, што тут амаль заўсёды брудна, слупы дыму на калідорах вечарамі, многа разбітых шыб. Звяртае ўвагу той факт, што іменна ў гэтым інтэрнаце ёсць выпадкі ўжывання спіртных напіткаў (з трох па універсітэту два ў інтэрнаце № 2). Сур'ёзны папрок быў зроблены універсітэту іменна па інтэрнату № 2. Не выпадкова А. Максімаў так упарта адмаўляўся прыгледзецца, што робіцца ў інтэрнаце, дзе ён жыве. Гэта і зразумела: патрэбна ж крытыкаваць сваіх таварышаў. Фатаграфаваць работу пажылых людзей куды лягчэй. А магчыма яшчэ і таму не захацеў, што на працягу работы ў студсавеце нічога так і не зрабіў: ні добрага, ні дрэннага. Праўда, цэлы год абяцаў зрабіць пакой дружбы (абяцаў заўсёды з энтузіязмам), але пакой усё-такі заканчвалі іншыя пасля яго перавыбрання. Зразумела, значна лягчэй крытыкаваць работу іншых, чым працаваць самому. Амаль ухіліўся ад патрэб студэнтаў, ад навядзення парадку ў інтэрнаце і студсавет. Так і жывуць студэнты ў інтэрнаце, чакаюць, калі прыйдзе якінебудзь «дзядзя» і аформіць ім залу для дыскатэк, зробіць спортпакой, зменіць прапускны рэжым. А калі нехта паспрабуе навесці парадак, адразу ж у гэтым бачаць парушэнне дэмакратыі. Міністра ледзь не ў бюракраты запісалі, зусім забыўшы пры гэтым, што дэмакратыя — гэта зусім не анархія, а перш за ўсё парадак і дысцыпліна, магчымасць абмеркавання той ці іншай праблемы і прыняцця найбольш правільнага рашэння. Была такая магчымасць і ў студсаветаў абмеркаваць Правілы пражывання ў інтэрнатах. Студсаветы інтэрнатаў №№ 1, 4, 6, 7 такую работу прарабілі, а ў інтэрнаце № 2 чакалі, калі хто-небудзь прыйдзе і зменіць правілы пражывання. Патрэбны тут самастойны студсавет. А пакуль... Нядаўна правялі гучнагаворачую сувязь вахты з паверхамі, павесілі дынамікі. За ноч дынамікі прапалі з паверхаў. А начныя дыскатэкі, за якія выступаюць некаторыя студэнты? Ніхто прынцыпова не супраць. Але ніхто з гэтых студэнтаў не заўважае іх вынікаў — выбітых шыб на паверхах і горы акуркаў.

Самакіраванне мае на ўвазе перш за ўсё арганізацыю студэнтаў, элементарнага парадку. І пакуль у інтэрнаце № 2 студэнты не зразумеюць гэтага, за іх ніхто нічога не зробіць.

Што датычыць канкрэтна прапускной сістэмы, то ўваход у інтэрнаты універсітэта для пабочных асоб магчымы з дазволу адміністрацыі ці студсавета з 8.00 да 23.00. Пры ўваходзе ў інтэрнаты студэнты універсітэта пакідаюць дакумент, які з'яўляецца пасведчаннем асобы, і рэгіструюцца ў кнізе наведвальнікаў. Для асоб, якія не маюць адносін да універсітэта, дзяжурны выклікае таго, да каго прыходзяць наведвальнікі, і ён абавязкова пакідае на вахце свой дакумент. Адказнасць за своечасовы ўход наведвальнікаў і захаванне імі правілаў унутранага распарадку нясуць жыхары інтэрната, якія запрасілі да сябе гасцей».

АД РЭДАКЦЫІ. Аўтар закрануў агульныя праблемы студэнцкага жыцця ў інтэрнаце. Да абмеркавання іх газета абавязкова звернецца ў наступных публікацыях.

Па ўзнятай жа тэме нават пасля доўгага чакання так і не давялося, на нашу думку, знайсці вычарпальны адказ і заўважыць канкрэтныя дзеянні з боку адпаведных арганізацый. Магчыма, убачым іх у справах студсаветаў і прафкомаў факультэтаў.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
21 красавіка
Зак. 1619.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара М.Г. ЗАГОРСКАЯ.